**Заключение.** Военные патологоанатомы принимали активное участие в победе над врагом. Вскрытия, проводившиеся непосредственно на поле боя, в войсковом районе позволяли установить причины смерти и полноту оказываемой помощи. Анализируя ошибки диагностики, эвакуации и лечения раненных, обязательно с учетом конкретных обстоятельств, в которых они были допущены, позволяли получать объективные данные о состоянии работы медицинской службы и оперативно исправлять эти дефекты.

### *Литература*


1. Гайдар Б.В. Роль медиков в Великой Отечественной войне. – Вестник Российской Академии наук 2005 – №11, стр. 5-12.

2. Чирский В.С. Становление и развитие патологоанатомической работы в Вооруженных Силах России (СССР): автореф. дис. докт. ист. наук. – Воен.-мед. акад. им. С.М. Кирова, 2004. – 45 с.

3. Бялик В.Л., Гулькевич Ю.В., Штерн Д.Р. Опыт советской медицины в Великой Отечественной войне 1941-1945 г.г. в 35т. Причины смерти на поле боя, в лечебных учреждениях войскового района от огнестрельных ранений по данным патологоанатомических вскрытий. – Медгиз., 1949-1955. – Т. XXXV. – 476 с.



***Сецько Маргарыта Анатольеўна***


## АДЗІНЫ, ХТО ВЯРНУЎСЯ: ХОМЧЫК УЛАДЗІМІР ВАСІЛЬЕВІЧ


УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»
Кафедра замежных моў

Навуковы кіраўнік – дацэнт кафедры замежных моў,
к.ф.н., дацэнт Ляскевіч С.Г.


Вайна пакінула крывавы след у гісторыі нашай краіны, нашай нацыі, нашай гісторыі, у памяці кожнага з нас. Многія памерлі на поле бою, засталіся інвалідамі. Вайна пакінула меткі на кожным пакаленні. Але памяць людская не сцірае жудасныя і гераічныя падзеі, не сціхае боль ад страт, не затуманьваецца слава герояў. Эстафета гэтай памяці перадаецца з пакалення ў пакаленне.

Репозиторий ГрГМУ

З цягам часу людзі па-іншаму пачынаюць успрымаць слова «вайна». Да паступлення ва ўніверсітэт я чула шмат гісторый з жыцця мужных салдатаў. Але мы сталеем, вучымся, і нашы веды і кругагляд пастаянна развіваюцца і папаўняюцца. Ёсць разуменне, што веды пра мінулае дапамагаюць пазбегнуць памылак у будучым, таму ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце шмат увагі надаецца вывучэнню слаўных старонак гісторыі нашай краіны. Напрыклад, ёсць праект «Жывая гісторыя» (і я свядомая актыўная яго ўдзельніца), у якім мы тэатралізавана расказваем глядачам нашых выстаў пра лёс значных людзей нашага горада.

У нашым універсітэце ўшаноўваецца памяць пра Вялікую Айчынную вайну, пра выкладчыкаў і студэнтаў, якія змагаліся за вызваленне Радзімы ад фашысцкай навалы, удзельнічалі ў партызанскім руху.

Адзін з іх – Хомчык Уладзімір Васільевіч. Як і многія нашыя выкладчыкі і студэнты, Уладзімір пайшоў на фронт змагацца за вызваленне Радзімы ад нацыстаў.

Хомчык Уладзімір Васільевіч у 1940 годзе паступіў на першы курс літаратурнага факультэта Гродзенскага настаўніцкага інстытута. Ён вырашыў стаць настаўнікам рускай мовы і літаратуры, бо гэта была запатрабаваная прафесія.

Курс навучання ў настаўніцкім інстытуце быў разлічаны на два гады, і меркавалася, што хлопец і яго аднакурснікі ў 1942 г. пойдуць на сваю першую вераснёўскую лінейку як маладыя педагогі. Аднак 22 чэрвеня 1941 г. Германія напала на Савецкі Саюз, Гродна ў хуткім часе быў акупаваны нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Пасля акупацыі ў памяшканні інстытута быў арганізаваны шпіталь, абсталяванне і навучальныя кабінеты былі знішчаны, 15-тысячны фонд бібліятэкі быў спалены.

Так сталася, што толькі ён адзін застаўся жывы з іх курсу. Пасля вызвалення Беларусі і заканчэння вайны хлопец вырашыў скончыць адукацыю і вярнуўся ў 1944 годзе да вучобы ўжо ў Гродзенскім дзяржаўным педагагічным інстытуце. На сайце нашага ўніверсітэта адзначаецца, што гэта быў адзіны студэнт, які адразу вярнуўся пасля вызвалення Беларусі за студэнцкую парту.

Рэпазіторый ГрГМУ

Будынак інстытута пасля вайны быў у кепскім стане, патрабаваў рамонту. А асобны студэнцкі інтэрнат з’явіўся ў нас у лютым 1945 года, гэта быў будынак па вуліцы Замкавай, 9. Ацяпленне было пячное, і студэнты разам з выкладчыкамі пасля заняткаў вымушаны былі нарыхтоўваць дровы ў вёсцы Парэчча. Тыя ж студэнты, хто жыў у занёманскай частцы горада, дабіраліся на вучобу пешшу, бо ў канцы 1940-х гадоў у Гродна яшчэ не працаваў грамадскі транспарт.

Але нягледзячы на цяжкія пасляваенныя ўмовы жыцця, студэнты і выкладчыкі актыўна займаліся вучобай, навукай, спортам. Для студэнтаў арганізоўваліся лекцыі аб міжнародным становішчы, на культурныя, гістарычныя і навуковыя тэмы. Студэнтаў-франтавікоў запрашалі на ўрачыстыя вечары расказаць аб сваім баявым шляху.

Пасля заканчэння інстытута Уладзімір Васільевіч паехаў на працу ў Бераставіцкі раён і імкнуўся як мага больш эфектыўна прымяняць атрыманыя веды на практыцы. Ён заўсёды з прыемнасцю ўспамінаў гады, што правёў у Гродзенскім педінстытуце.

Студэнцкі і камсамольскі білеты і дыплом Хомчыка У.В. перадала ў музей Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта яго дачка. А пошукавую работу па знаходжанні звестак аб былых студэнтах і выкладчыках ГрДУ арганізаваў былы дырэктар музея (з 2005 па 2017 гг.) Уладзімір Сытых.

Такіх гісторый, такіх перарваных вайной лёсаў шмат не толькі на Гродзеншчыне: дзеці і моладзь, як і дарослыя, прайшлі праз «змяіныя скруткі дроту». І гэта жахліва. Вайна не шкадавала нікога…

Мы павінны ведаць сваю гісторыю. Якая б яна ў нас не была, але гэта след у нашым жыцці, у нашай памяці, ва ўспамінах нашых продкаў. Галоўнае, – гэта вучыцца на памылках і не дапусціць паўтора такой крывавай і заўсёды страшэннай вайны.

***Спіс выкарыстаных крыніц***

1. У вытокаў стварэння (1940-1944). – Электронны рэсурс. – Рэжым доступу: https://www.grsu.by/by/galounaya/universitet/ad-gimnazii-da-universiteta/item/22563-object2.html. – Дата доступу: 25.03.2019.

Репозиторий ГрГМУ